# СТАН СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ Ў ПОЛАЦКУ Ў ЧАСЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

***Барысенка К.С.***
Полацкі каледж ВДУ імя П.М. Машэрава

Гісторыя адукацыі з’яўляецца неад’емнай часткай агульнай гісторыі Беларусі. Развіццё асветы на беларускіх землях на працягу гістарычнага шляху праходзіла вельмі складана і супярэчліва. У развіцці грамадства разам з эканомікай, культурай, сацыяльнай і палітычнай сферамі надзвычай важную ролю адыгрывае перадача ведаў ад пакалення да пакалення.
Стан і сістэма адукацыі непасрэдна звязана з тымі падзеямі, што адбываюцца ў краіне.

Гіпотэза: магчыма, падчас акупацыі ў Полацку дзейнічалі навучальныя ўстановы, якія праводзілі работу па анямечванні мясцовых дзяцей, выхоўвалі іх у духу фашысцкай ідэалогіі. Можна меркаваць, што пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Полацку пачала аднаўляцца савецкая сістэма адукацыі;

Мэта даследавання: вызначыць становішча адукацыі ў Полацку ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Задачы: прасачыць палітыку акупацыйных улад у галіне адукацыі; вызначыць, якія тыпы навучальных устаноў існавалі ў Полацку ў гады Вялікай Айчыннай вайны; прааналізаваць змест і сутнасць адукацыйнага працэсу; кантэнт-аналіз архіўных дакументаў і матэрыялаў, успамінаў; параўнанне інфармацыі, апісанне; агульнагістарычныя метады.
Актуальнасць дадзенай тэмы вынікае са ступені яе вывучанасці. Тэма з'яўляецца маладаследванай і заслугоўвае ўвагі.

На 1941 год у БССР налічвалася 12.294 агульнаадукацыйныя школы, у якіх навучалася больш за 1,7 млн чалавек, 25 вышэйшых навучальных устаноў з колькасцю студэнтаў 21,5 тыс. чалавек. 128 спецыяльных вучэбных устаноў з 35 тыс. навучэнцаў, дзейнічалі больш за 50 навуковых устаноў, 20 тэатраў, 26 музеяў, тысячы культасветустаноў.

У Полацку, з успамінаў полацкага настаўніка, краязнаўца І.П. Дэйніса, перад вайной дзейнічалі 16 школ, з якіх адна руская № 10, адна польская №7, адна яўрэйская №6, астатнія былі беларускія [2, с. 230].

Сярэдне-спецыяльная адукацыя ў Полацку была прадстаўлена педагагічным вучылішчам, будаўнічым тэхнікумам, лясным тэхнікумам, аўтадарожным тэхнікумам, двухгадовай школай медсясцёр.

Таксама ў Полацку ў даваенны час дзейнічалі дзве вячэрнія школы рабочай моладзі. У цэнтры горада існавала школа для дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні і выхаванні.

На чыгуначным вузле Полацк працавалі дзве школы № 14 і № 15, якія то пераходзілі ў веданне аддзела школ Беларускай чыгункі, то вярталіся пад

кіраўніцтва гарадскога аддзела адукацыі. Працавала дзіцячая тэхнічная станцыя, якая была абсталявана станкамі па апрацоўцы дрэва і металу.

Да пачатку вайны ў Полацку дзейнічала некалькі дзіцячых дамоў. На жаль, Полацкі дзіцячы дом № 1 у 1941 годзе не паспеў эвакуіравацца, быў перахоплены гітлераўцамі ў дарозе і вернуты назад у Полацк. Акупацыйныя ўлады планавалі выкарыстоўваць дзяцей у якасці донараў для нямецкіх салдат. У такіх умовах наладзіць навучальны працэс у дзіцячым доме было немагчыма. Галоўнае было выжыць.

16 ліпеня немцы цалкам акупіравалі Полацк. У хуткім часе пасля захопу горада нямецкія акупацыйныя ўлады сталі выкарыстоўваць будынкі навучальных устаноў для сваіх мэт.

Так, напрыклад, у будынку Ляснога тэхнікума акупацыйнымі ўладамі быў арганізаваны шпіталь для войска Уласава з ваеннапалонных савецкіх салдат. У 16 школе (потым другой) па вуліцы Фрунзэ размяшчалася паліцэйская школа. У памяшканні першай гімназіі знаходзілася афіцэрская сталовая і дом распусты для нямецкіх афіцэраў.

У цэнтры горада ў былой музычнай школе па вуліцы Войкава № 6 і побач у жылым доме размяшчалася паліцыя, жандармерыя, камендатура, гестапа [2, с. 230].

Як толькі немцы акупіравалі Полацк, яны пачалі шукаць членаў партыі, савецкіх і партыйных работнікаў, сярод якіх былі і настаўнікі.

У першыя дні былі павешаны некалькі чалавек, а потым рэпрэсіі сталі сістэматычнымі. Быў растраляны былы дырэктар чыгуначнай школы пры станцыі Полацк І. Мухін. Быў павешаны бібліятэкар дому Чырвонай Арміі Д.І. Клетнікаў, які з 1942 года быў у партызанах [2, с. 233].

Вядома таксама, што полацкі бургамістр Пятроўскі Дзмітрый Браніслававіч прыцягнуў на работу ў нямецкую Управу сваіх знаёмых настаўнікаў: Міндалева, Жаваранкава, Шалаева, Маніса. Пятроўскі супрацоўнічаў з партызанамі і падпольшчыкамі, дапамагаў палачанам. Па нявысветленых абставінах настаўнікі былі схопленыя і растраляныя немцамі. Выжыць змог толькі выпускнік Полацкага педагагічнага тэхнікума Н.А. Маніс. Ён паспеў пакінуць горад і перайшоў да партызан.

Выкладчыкі Ляснога тэхнікума працавалі на немцаў у арганізацыі "Віко" ў справе гарадской прамысловасці. Завуч тэхнікума Сіманаў вымушаны быў узначаліць лясную гаспадарку, выдзяляць немцам дзялянкі дзеля нарыхтовак драўніны. Сіманаў пасля вайны быў асуджаны, але потым рэабілітаваны.

Сакратар камсамольскай арганізацыі лястэхнікума Мядзведзеў служыў у паліцыі і даслужыўся да афіцэрскага звання і ўзнагароды [2, с. 241].

Выкладчыкі педагагічнага вучылішча Багроў І.В., Гурчонак І.С., Дайнэка Ф.Т., Ліпень М.І., Маніс Н.А., Саладуха А.І., Чабоха Т.І. з першых дзён вайны ўключыліся ў актыўную барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх

захопнікаў у складзе партызанскіх атрадаў, падпольных арганізацый самаахвярна змагаліся з ворагам у дзеючай Чырвонай арміі.

Такія выпускнікі педагагічнага вучылішча даваеннага часу, як Т.С. Марыненка, Л.П. Касцецкая, А.Д. Бельская з`яўляючыся падпольшчыцамі, сувязнымі партызанскіх атрадаў праявілі мужнасць, стойкасць і гераічна загінулі, але не выдалі немцам інфармацыю пра дзейнасць беларускіх патрыётаў.

У час акупацыі Аддзел народнай адукацыі ўзначальваў настаўнік Сафрановіч. Ён імкнуўся арганізаваць працу школ, знайшоў некалькі настаўнікаў, большасць з якіх усімі магчымасцямі імкнуліся ўхіліцца ад працы ў школах. Каб давесці сваю прыхільнасць да новага парадку, ён выступаў з публічнымі лекцыямі, у якіх абвяргаў правільнасць вучэння Маркса [2, с. 221].

Вялікімі намаганнямі ў Полацку ў пачатку акупацыі было адчынена некалькі школ, настаўнікаў абязалі выйсці на працу пад пагрозай жорсткіх пакаранняў, але частка з іх схавала сваю прафесію.

У школах, якія пачалі працаваць, моладзь вучылася не толькі чытаць і пісаць, лічыць да пяцісот. Гітлераўскія чыноўнікі праяўлялі зацікаўленасць да зместу навучальна-выхаваўчага працэсу ў школах і настойвалі на тым, каб у вучэбных планах належнае месца заняло выкладанне нямецкай мовы, гісторыі і геаграфіі Германіі [1, с. 305].

У класе павінен быў вісець партрэт А. Гітлера. Настаўніку, які заходзіў у клас, неабходна было вітаць навучэнцаў паднятай правай рукой з выклічам “Хайль Гітлер!” Вучні павінны былі такім жа чынам адказваць настаўніку. Перад пачаткам урока вяліся гутаркі пра Гітлера і яго паплечнікаў, пра жыццё народаў у Новай Еўропе, перамогах вермахта.

Немцы ўвялі для школ адмысловыя праграмы ў духу Рэйха і Новага парадку. З падручнікаў выдзіраліся старонкі, дзе пісалася пра партыю, пра перамогу сацыялізму, поспехі савецкай улады і таму падобнае [2, с.239].

Усе савецкія падручнікі былі немцамі забракаваныя. Настаўнікаў прымушалі зафарбоўваць тэксты, асобныя фразы або заклейваць часткі старонак ці ўсю старонку цалкам. Савецкія праграмы па прадметах таксама былі замененыя.

Падчас ваенных дзеянняў у Полацку былі знішчаны ці сурёзна пашкоджаны ўсе школьныя будынкі, педагагічнае вучылішча, будаўнічы тэхнікум [3, ф.687; воп.1; с.1, с. 2].

Такім чынам, нямецкія акупацыйныя ўлады імкнуліся арганізаваць школьную адукацыю ў Полацку, дзе прапагандавалася фашысцкая ідэалогія. Але з прычыны адсутнасці вучняў на занятках, адмовы настаўнікаў працаваць у такіх школах, рэпрэсій сярод мірнага насельніцтва школьная адукацыя практычна не функцыяніравала.

Таксама з успамінаў І.П. Маніса вядома, што настаўнікам не хацелі плаціць заробак, што абавязана была рабіць гарадская ўправа. Не было срод-

каў на ўтрыманне школ. Вучні школы ў Полацку або не наведвалі, або іх было вельмі мала [2, с. 239].

Сярэднія спецыяльныя ўстановы Полацка былі пашкоджаныя бамбардзіроўкамі або перапрафеліяваныя немцамі ў мэтах ажыццяўлення акупацыйнай палітыкі і не працавалі.

Практычна адразу пасля вызвалення Полацка ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пачалася праца па аднаўленні сістэмы адукацыі на савецкай аснове.

Так, 1 верасня 1944 года аднавілі працу школы № 1, 2, 3, а таксама чыгуначная школа. Восенню 1944г. пачалі працаваць педвучылішча, а ўвесну 1945 года Лясны тэхнікум. У 1945 годзе – музычныя школа і школа медсёстраў.

У галіне культурнага будаўніцтва першапачатковымі задачамі сталі аднаўленне і далейшае развіццё народнай адукацыі, устаноў навукі, мастацтва, культуры на савецкай аснове.

1. Гісторыя культуры Беларусі / С. А. Парашкоў. – 2-е выд. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 444 с.

2. Дэйніс І.П. Полацкая даўніна / І.П. Дэйніс; уклад, прадм. і камент. М. Баўтовіча; пер. з рускай мовы М. Ермалаева. – Мн: Медисонт, 2007. – 330 с.

3. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку, ф. 687. воп. 1 спр.: 1; ф. 1081. воп. 1. спр.: 2; 4 ; 6; 7; 12; 13; 14.

4. Ільінскі П. Тры гады пад нямецкай акупацыяй у Беларусі // ARCE. – № 3. – 2004. – С. 207–247.

5. Куракевіч Н. І. Развіццё сярэдняй школы і прафадукацыі ў Беларусі ў аднаўленчы перыяд // Народная асвета. – 2001. – № 11. – С. 64–69.

6. Памяць: гіст. дакум. хроніка Полацка / рэд. кал.: Г. П. Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 2002. – 912 с.

7. Чтобы жизнь продолжалась всегда!: сб. матер. / сост.: Е.П. Мартинкевич, В.А. Алексеенко. – Полоцк: Полацкі друкар, 2020. – 187 с.

## СТРАНИЦЫ ИСТОРИИ ПОЛОЦКОГО КОЛЛЕДЖА ВГУ ИМЕНИ П.М.МАШЕРОВА

***Пилюшина А.М.***

Полоцкий колледж ВГУ имени П. М. Машерова

Непременный закон развития общества – интерес к его прошлому. Система образования Полоцка имеет многовековую богатую историю. Достойное место в ней занимает Полоцкий колледж учреждения образования «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова» – старейшее в Республике Беларусь среднее специальное учебное заведение, которое в 2022 году отмечает своё 150-летие. В рамках подготовки к юбилею становится особенно актуальной проблема исследования истории его деятельности от прошлого к настоящему.